Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынга

**Хроніка**

**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2015 г.**

## Мерапрыемствы да Дня Перамогі,
## Дня Дзяржаўнага герба РБ и Дзяржаўнага сцяга РБ

*4 мая*

Перад супрацоўнікамі культуры Кобрыншчыны выступіла літаратурна - паэтычная група «Час і ты» з паказальнай праграмай «Будуць доўга пахнуць порахам словы ... » . У праграме літаратурна - музычнай кампазіцыі гучалі вершы М. Джаліля, С. Гудзенко, Ю. Друнінай, кобрынскага паэта Л. Глушко. Гучалі песні «У зямлянке» і «Синий платочек» у выкананні Л. Туруцько .

*ЦБ*

*8 мая*

Сумесна з работнікамі ДК прайшоў ўрок мужнасці "Учора скончылася вайна" , прысвечаны 70- годдзю Вялікай Перамогі. У праграме гучалі вершы Юліі Друнінай, Канстанціна Сіманава, Ягора Ісаева, песні "Жураўлі" і "Майскі вальс" у выкананні дырэктара ДК Ірыны Каранько. Афармлена кніжная выстава "Гартаючы Летапіс Вялікай ... ", з якой навучэнцы пазнаёміліся ў канцы мерапрыемства .

*Навасёлкаўская СБ, 50 чал.*

*9 мая*

Выступленне ЛПГ “Победа к памяти взывает”. У праграме мерапрыемства гучалі вершы Канстанціна Сіманава, Юліі Друнінай, Леаніда Глушко. Для прысутных падрыхтавана выстава ваенна-патрыятычнай літаратуры “Подвиг великий и вечный” і прадэманстравана відэапрэзентацыя “Жывы назаўжды”.

*Астроміцкая СБ, 30 чал.*

*10 мая*

Інфармацыйная гадзіна “Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь”. Для прысутных падрыхтавана выстава “Наш герб і наш сцяг – гэта сімвалы свабоды”, прапанаваны цікавае паведамленне аб значэнні беларускай сімволікі і віктарына.

*Патрыкаўская СБ, 19 чал.*

*13 мая*

Сумесна з сельскім клубам праведзена літаратурна - музычная кампазіцыя “Вечная памяць героям”. Для ветэранаў і прысутных гучалі цёплыя словы віншаванняў са святам, песні ў выкананні народнага хору. Дзеці падрыхтавалі выставу малюнкаў "Перамога вачыма дзяцей". Бібліятэкар прадставіла ўвазе гледачоў кніжную выставу "Беларусь: гісторыя Перамогі".

*Балоцкая СБ, 20 чал.*

## Мерапрыемствы да Дня сям’і

*15 мая*

Святочны вечар “Самое главное слово – семья”. Для прысутных падрыхтаваны выступленні ЛПГ “Натхненне” і аматарскага клуба “Крыніца”, выстава перыядычных выданняў “Формула сямейнага шчасця”. У канцы мерапрыемства ўсе жадаючыя прынялі ўдзел у конкурсе “Народная мудрость гласит” і бліц-турніры “Родительский дом-начало начал”.

*Гарадзецкая СБ, 15 чал.*

*16 мая*

Вечар-конкурс “У нас в семье читают все”. Мерапрыемства падрыхтавана сумесна з БелТІЗ. Прысутныя расказвалі пра любімыя кнігі, удзельнічалі ў віктарыне. На працягу вечара ішла гаворка аб ролі сям’і ў жыцці кожнага чалавека. Усім на памяць уручылі каштоўныя падарункі.

*Дзівінская СБ, 25 чал.*

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

*15 мая*

Навучальны семінар для сельскіх бібліятэкараў Кобрынскай РЦБС. У рамках семінара гал. бібліёграф ЦБ Курачук С.Д. правяла трэнінг “Фарміраванне электронных паўнатэкставых баз дадзеных ваеннай тэматыкі”. Бібліятэкар Залескай с/б Пакалюк І.В. прадставіла электронную прэзентацыю “Праца Залескай сельскай бібліятэкі да 70-годдзя Вялікай Перамогі”. Загадчыца аддзела камплектавання Аляшкевіч Т.М. расказала аб падрыхтаваным метадычным дапаможніку “Улік бібліятэчнага фонду” з серыі “Асновы дзейнасці сельскай бібліятэкі”.

*ЦБ, 70 чал.*

*24 мая*

Адбылося пасяджэнне клуба “Пунцовая кветачка” на тэму “Спасибо, не курю”. Аформлена кніжная выстава, падрыхтаваны расказ пра шкоду курэння для чалавека. У канцы мерапрыемства дзеці малявалі плакат на тэму здаровага ладу жыцця.

*Буховіцкая СБ, 12 чал.*

*25 мая*

Стартавала праграма летняга чытання "Летом с книгой я дружу". Дзеці дзяліліся ўражаннямі аб прачытаных кнігах за навучальны год. Адбылося ўшанаванне самых актыўных чытачоў. Бібліятэкар падрыхтавала спіс літаратуры для летняга чытання і зрабіла рэкамендацыйны агляд кніг. Усе школьнікі завялі дзённікі летняга чытання , па выніках якога будзе вызначаны лепшы чытач лета- 2015 .

*Залесская СБ, 15 чал.*

*28 мая*

У рамках акцыі “Брэстчына без табака” адбыўся ўрок здаро’я “Табак – табе вораг”. Удзельнікамі сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа. Для прысутных падрыхтаваны: кніжная выстава “Вредным привычкам скажем “НЕТ”, літаратурна-пазнавальная кампазіцыя “Табак – тебе враг”, відэафільм “Курение – биохимия убийства”.

*ЦБ, 25 чал.*

Выканаўца Мілашук Т. І.
2 – 36 - 81